**ВІРОЎКА** – вёска ў Бароньказаўскім сельскім Савеце, за 48 км на ПдЗ ад Касцюковіч, 21 км ад чыгуначнай станцыі Бялынкавічы на лініі Крычаў Сураж. 204 км ад Магілёва. на р. Свінка (прыток р. Бесядзь), на З невялікае возера. Транспартныя сувязі па прасёлачнай і далей па аўтадарозе Крычаў – Сураж.

Вёска вядома з 18 ст. як дзяржаўная ўласнасць у Крычаўскім старостве. У 1765 г. вёска, 4 дымы, у Прапойскім старостве, уласнасць казны. У 1769 г. слабада Вірава, гута, і млын. У 1786 г. – 10 двароў, 47 жыхароў, у Быхаўскім павеце. У 1799 г. 15 двароў, 92 жыхары. У 1811 г. вёска, 47 сялянскіх душ мужчынскага полу, уладанне памешчыка Івана Цеханавецкага, у Клімавіцкім павеце Магілёўскай губерні. У 1834 г. – 26 двароў, 116 жыхароў. У 1850 г. – 111 жыхароў. У 1858 г. – 37 двароў, 230 жыхароў, ва ўладанні памешчыка Л. І. Беліковіча, у Клімавіцкім павеце. У 1880 г. вёска, 52 двары, 366 жыхароў, у Машаўской воласці Чэрыкаўскага павета Магілёўскай губерні. 25 двароў займалася возніцкім промыслам, даход з якога складаў 10-40 руб. З 1893 г. вёска адносілася да Машаўскога праваслаўнага прыхода Міхайлаўскай царквы. Паводле перапісу 1897г. - 66 двароў, 531 жыхар, піцейны дом у Машаўской воласці. На пачатку 20 ст. вёска, 526 дзес. зямлі, належала Мокраўскай сельскай грамадзе. У 1909 г. 70 двароў, 535 жыхароў. У пачатку 1920-х г. адкрыты 4-гадовая школа (у 1925г. 36 вучняў), хата-чытальня, гурток па ліквідацыі непісьменнасці сярод дарослых, с.-г. арцель “Чырвоная зорка” і т-ва па сумеснай апрацоўцы зямлі. З 20.08.1924 г. вёска ў Мокраўскім сельскім Савеце Бялынкавіцкага раёна Калінінскай, з 04.8.1927 г. Касцюковіцкага раёна Магілёўскай акругі. У 1926 г. тут налічвалася 167 двароў. Меліся вятрак, крупарушка. У 1929 г. створаны калгас “Бальшавік Беларусі”, працавалі кузня, ваўначоска. Паводле перапісу 1959 г. – 231, у 1970 г. – 179 жыхароў. У 1986 г. – 35 гаспадарак, 90 жыхароў, у складзе саўгаса “Зарэчны” (цэнтр – в. Вялікі Бор), працаваў магазін. Планіровачна складалася з дугападобнай вуліцы, забудаванай двухбакова драўлянымі дамамі сядзібнага тыпу. Зараз будынкі разбураны і пахаваны пад тоўстым пластом зямлі.

У сувязі з аварыяй на Чарнобыльскай АЭС жыхары вёскі (35 сямей) ў 1994 г. пераселены ў п. Вялікая Крапіўня.